# З БЕРАСТАВІЦАЙ ЛЁСАМ ЗНІТАВАНЫЯ. МАГНАЦКІ РОД ХАДКЕВІЧАЎ

Мурашкіна М.С.
Гродненский государственный медицинский университет, Беларусь
Кафедра социально-гуманитарных наук
Научный руководитель- доцент Стасевич Н.П.

**Актуальнасць.**У XVI-XVII ст.ст. род Хадкевічаў быў адным з самых вядомых і славутых магнацкіх родаў у ВКЛ, які даў княству трох Вялікіх гетманаў: Івана Федаравіча (1476-1484гг), Рыгора Аляксандравіча (1566-1572 гг), Яна Кароля (1605-1621гг). Значнасць іх роду падцвярджае і тое , што у 1566 годзе трое з Хадкевічаў засядалі ў Радзе ВКЛ: Вялікі гетман Літоўскі, кашталян троцкі, адміністратар Лівоніі. Былі яны людзі высокаадукаваныя, з пачуццем гонару, гарачыя патрыеты сваей зямлі. Гісторыя гэтага роду цікавая і актуальная для ўсіх беларусаў.

**Мэта, задачы і метады даследавання.** Прааналізаваць біяграфію і жыццёдзейнасць прадстаўнікоў роду Хадкевічаў даследуючы розныя крыніцы інфармацыі, вызначыць ролю і значэнне іх дзейнасці ў развіцці ВКЛ.

Знакаміты магнацкі род Хадкевічаў быў разнагалінаваны. Адной з галін яго была Берестаўіцкая, якая бярэ свой пачатак з Аляксандра Хадкевіча. Даравальнай граматай ад 12 ліпеня 1506 года кароль Польскі і Вялікі князь Літоўскі Аляксандр падараваў маршалку дворнаму А.Хадкевічу Бераставіцу і навакольныя "селы з людзьмі,што ў Бераставіцы сядзяць"[1 с.178].

Сын Аляксандра - Рыгор Аляксандравіч, быў адным з наймагутнейшых магнатаў ВКЛ другой паловы XVIст. З 1554г- ваявода віцебскі, 1555г -ваявода кіеўскі, 1559г -кашталян троцкі, з 1561г- гетман польны літоўскі, з 1564г - кашталян віленскі, з 1566г - Вялікі гетман Літоўскі [2 с.156].

Вялікія арганізатарскія і тактычныя здольнасці, асабісты гераізм і адвага Р.А.Хадкевіча праявілася ў час ваенных дзеянняў у Лівоніі. Найбольш слаўную перамогу гетман атрымаў над ракой Улай, паблізу Оршы. Тут, 26 студзеня 1564г ён разбіў 24-тысячную раць рускага войска пад кіраўніцтвам ваяводы Пятра Шуйскага. Перамога пад Улай мела важнае значэнне для Літвы [1 с.57].

Займаючы высокія дзяржаўныя пасады, Рыгор Хадкевіч актыўна змагаўся за самастойнасць ВКЛ, быў апантаным праціўнікам Люблінскай уніі 1569 г., у тым жа годзе, у знак пратэсту супраць а'бяднання ВКЛ з Польшчай у федаратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую, адмовіўся ад ўсіх дзяржаўных і адміністрацыйных пасад і некалькі месяцаў правеў у адзіноце ў Заблудове і Вялікай Бераставіцы.

Хадкевіч унес асабісты ўклад у развіцце кнігадрукавання.Сваей падтрымкай праваслаўнага кнігадрукавання, гетман Хадкевіч выклікаў незадавальненне ў каталіцкага духавенства і каталіцкай шляхты. У 1570 г. быў вымушаны спыніць друкарскую справу. Заснаваная Хадкевічам друкарня ў Заблудове адыграла значную ролю ў станаўленні і развіцці кнігадрукавання ў Беларусі.

12 лістапада 1572 года Рыгора Аляксандравіча не стала, а Бераставіца перайшла ва ўласнасць дзяцей яго брата - кашталяна троцкага Юрыя Хадкевіча [3 с.123].

Памяць пра род Хадкевічаў шануецца бераставічанамі. Згадваецца ў музеі, у раеннай кнізе "Памяць". У галярэі знакамітых землякоў можна бачыць іх партрэты. Да 1940 года адна з вуліц была названа ў гонар Хадкевічаў. Хочацца спадзявацца, што прыйдзе час і можна будзе прайсці Бераставіцай па вуліцы з такой назвай.

**Літаратура:**

1. Чаропка, В. Уладары Вялікага княства / В. Чаропка. Мн.: Беларусь, 2007.
2. Чарняўскі, М. Правадыр крылатых вершнікаў / М. Чарняўскі. – Мн.: Тэхналогія, 1998.
3. "Памяць. Гісторыка – дакументальная хроніка Бераставіцкага района". – Мінск: Белта, 1999.

Рэпозиторий ГрГМУ